**Аляксей Карпюк**

# Мая Гродзеншчына

Нарыс

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
*Рэдакцыя мастацкай літаратуры*
Мінск 1960

Малады беларускі празаік, аўтар трох аповесцей («У адным інстытуце», «Дзяўчына з Ваўкавыска», «Данута»), Аляксей Карпюк нярэдка звяртаецца і да аператыўнага жанра — нарыса.

Паездкі па сёлах і гарадах Гродзеншчыны, цікавыя знаёмствы і шчырыя гутаркі з рабочымі і калгаснікамі далі магчымасць Аляксею Карпюку сабраць багаты матэрыял пра сённяшні дзень аднаго з куткоў былога заходнебеларускага краю, прыкмеціць тыя змены, якія адбыліся ў жыцці людзей за гады Савецкай улады.

Параўноўваючы мінулае Гродзеншчыны з яе сённяшнім, аўтар паказвае веліч стваральнай працы савецкіх людзей, іх цвёрды поступ у светлае і шчаслівае заўтра — камунізм.

# 1. ЧАСЫ МІНУЛЫЯ

Гродзеншчына мае багатую і цікавую гісторыю.

Сівыя каменні гродзенскіх вуліц памятаюць Пятра І. Тут капаў ён першыя рэдуты, сустракаючы Карла XII перад Палтаўскай бітвай.

Гэта на Гродзеншчыне нарадзіўся і ў гродзенскіх лясах змагаўся ў 1863 годзе Валерый Врублеўскі, пазней генерал Парыжскай камуны, член І Інтэрнацыянала. Гэта пра яго сказаў Ленін, што памяць аб В. Врублеўскім «непарыўна звязана з найвялікшым рухам пралетарыяту ў XIX стагоддзі...»

З-пад Свіслачы распраўляў свае арліныя крыллі Кастусь Каліноўскі. Гэта Гродзеншчына спарадзіла і натхніла Элізу Ажэшку і Адама Міцкевіча, Цётку і Карскага.

Рэвалюцыйныя выступленні гродзенскага пралетарыяту пачаліся адначасова з выступленнямі рабочых Пецярбурга. Яшчэ і цяпер у нашых гарадах і сёлах жывуць матросы «Аўроры», уДзельнікі штурму Зімняга палаца, будзёнаўцы.

Пяць з паловай стагоддзяў таму назад, рыхтуючыся да Грунвальдскай бітвы з мечаносцамі, уся руская і польская армія рыхтавала ў гродзенскіх лясах зубровае мяса. Цяпер зубры жывуць толькі ў Белавежскай пушчы і ў заапарку. Мяса хапае на калгасных фермах. Ды не толькі мяса! Гэта на Гродзеншчыне, у Скідзелі, паявіўся першы беларускі цукар! А на Брусельскай міжнароднай выстаўцы побач з мінскім самазвалам красаваліся і памнажалі славу Радзімы крышталёвыя вырабы з шклозавода «Нёман».

Амаль чатырыста гадоў таму назад польскі кароль Стэфан Баторы прывёз на Гродзеншчыну цэлую армію ксяндзоў і манахаў ордэна езуітаў і «падарыў» ім пятнаццаць тысяч прыгонных — мясцовых сялян. Але не пакарыў тутэйшых людзей.

Паводле дадзеных Гродзенскага архіва, у гарадскую турму ў красавіку 1934 года пілсудчыкі кінулі дзевяноста пяць мужчын і адзінаццаць жанчын, абвінавачваючы іх у «камунізме». А ў 1938 годзе ў сырых гродзенскіх казематах тамілася ўжо трыста два камуністы. Дзяўчаты, адсылаючы ў турму пасылкі, вышывалі тавары-шам на сурвэтках: «Хлопцы, стойце насмерць!»

— Стаім насмерць! — вуснамі паэта-вязня Валянціна Таўлая адказвалі ім з турэмных камер.

І сапраўды, стаялі! Стаялі і падбадзёрвалі другіх. У калектыўным пісьме, адасланым у рэспубліканскую Іспанію, гродзенскія камуністы-падпольшчыкі заклікалі байцоў Інтэрнацыянальнай роты імя Сяргея Прытыцкага:

— Стойце насмерць!

Сына беднай удавы Уладзіміра Кірвяка, сакратара падпольнай камсамольскай ячэйкі, паклікалі ў «пастарунак паліцыі панствовай».

Камендант «пастарунка» з лішняй далікатнасцю запрасіў Кірвяка ў кабінет, пасадзіў за стол і сказаў:

— Раю вам ва ўсім прызнацца і расказаць аб падпольнай рабоце!

Кірвяк маўчаў. Тады камендант паказаў маток дроту і з цынічнай усмешкай прыгразіў:

— Не прызнаешся,— увесь гэты дрот будзе ў тваім жываце...

Валодзя маўчаў.

Праз некалькі дзён яго труп паліцыя аддала маці з заключэннем доктара: «Скончыў жыццё самагубствам, праглынуў сорак восем сантыметраў дроту...»

Звар'яцелая маці потым скардзілася сусе-дзям:

— Людцы добрыя, хіба ж можа чалавек з'есці дрот?

— Ваш Валодзя стаяў насмерць!—растлумачылі ёй.

Пра подзвіг Скідзельскіх камсамольцаў у дні Айчыннай вайны ведае кожны вучань. Пра іх можна напісаць раман. Стары і малады гаворыць, што на Гродзеншчыне ёсць свае «краснадонцы».

Аднаго разу па Азёрскай шашы каля Гродна немцы вялі савецкіх ваеннапалонных. Васемнаццацігадоваму масквічу Васю ўдалося схавацца ў лесе. Вечарам акрываўленага Васю знайшоў яго равеснік вясковы хлапец Сеня Таранка з хутара Крушнікі. Сеня схаваў чырвонаармейца. Даведаліся немцы, схапілі Сеню і яго маці. Яны не выдалі чырвонаармейца.

На падворку Гродзенскай турмы Сеня памёр на руках у маці. Вось яго апошнія словы:

— Мама, даруй, я інакш не мог!

— Ведаю, сынку,— сказала маці, залiваючыся слязьмі і апошні раз цалуючы акрываўленага сына...

Аднойчы група партызанскага атрада імя Кастуся Каліноўскага, вяртаючыся з задання, заблудзілася. Каб не натрапіць на немцаў, партызаны вырашылі дачакацца світання і залеглі ў полі. Калі нарэшце развіднела, яны жахнуліся. Аказалася, што яны ляжалі перад амбразурамі нямецкага дота ў адкрытым полі. Сярод іх быў сірата Міша Кучынскі. Міша сказаў сябрам:

— Я выклічу агонь на сябе, а вы, хлопцы, ратуйцеся!

І Міша пабег па адкрытым полі. Немцы сталі страляць, а потым пагналіся за партызанам. У той час група непрыкметна адпаўзла ў другі бок.

Міша загінуў.

Такіх прыкладаў многа. Іх на Гродзеншчыне перадаюць з вуснаў у вусны. На іх выхоўваюцца новыя пакаленні.

# ІЛЬЯ ПАТ І ЯГО ПЕЧ

Калі вы будзеце ў Гродна і траніце на вуліцу Савецкіх пагранічнікаў, дык насупраць новага кінатэатра імя Пушкіна звярніце ўвагу на чырвоны старэнькі домік з блакітнымі аканіцамі.

Цяпер на ім вісіць звычайны парадкавы нумар — 48, а ў доміку жывуць звычайныя гродзенцы. Але быў час, калі тут адбыв. ліся вялікія справы.

Пачалося ўсё гэта задоўга да рэвалюцыі. Адзін майстра-яўрэй — Ісак Пат сталярнічаў у

Ласаснянскім млыне. Багацце ён меў звычайнае: залатыя рукі і вялікую сям'ю. Надышоў 1905 год.

Раскаты рускай рэвалюцыі дакаціліся і да Гродна. У горадзе быццам хто закруціў вялікае млынавое кола. Зачапіла яно і сыноў столяра. Прыбягаючы дамоў, хлопцы ўсхвалявана паведамлялі:

— На станцыі і на фабрыцы Шарахоўскага бастуюць!

— На Саборнай выстралілі ў жандара! Там зараз казакі б'юць прахожых.

— Мама, з гаўптвахты дваццаць шостай артылерыйскай брыгады ўцёк салдат Цвяткоў! За забастоўку ў палку яго прыгаварылі да расстрэлу!

— Дзеткі, нікуды не лезьце. Пападзецеся ў турму!- непакоілася маці. Сэрца яе чуяла небяспеку.

— А ты хочаш, каб яны, калі вырастуць, гнулі, як я, спіны на багатых? — заступаўся за сыноў бацька.

Сыны кожны раз прыходзілі дахаты прамоклыя да ніткі, абарваныя, пабітыя. Маці толькі ўздыхала. Неўзабаве арыштавалі старэйшага — Мішу, а за ім і Веньяміна. Ноччу арыштантаў, якіх з Гродзенскай турмы адпраўлялі ў Сібір, выводзілі на вакзал. Ісакава жонка бачыла, як вялі яе сыноў. Яны нешта крычалі, але кандалы звінелі так моцна, што маці нічога не зразумела. З катаргі сыны не вярнуліся.

Пасля імперыялістычнай вайны ў ласасянскага столяра застаўся толькі самы малодшы сын — кравец Ілья. І ён, верны сямейным традыцыям, прадаўжаў справу сваіх братоў.

У часы буржуазнай Польшчы камуністы працавалі ў глыбокім падполлі. Літаратуру для Заходняй Беларусі падпольшчыкі атрымлівалі "з Вільні. Але там было шмат шпікаў, людзі часта траплялі ў рукі паліцыі. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі вырашыў знайсці іншае месца для падпольнай друкарні. Выбар паў на ціхі ў тыя часы горад Гродна. Дзеля гэтага трэба было знайсЦі сям'ю з даўнімі рэвалюцыйнымі традыцыямі.

Аднойчы да члена падпольнай ячэйкі Ілы Пата звярнуліся з прапановай паставіць у яго хаце друкарскі станок. Ілья, не задумваючыся, згадзіўся і ўзяўся за справу.

З гэтага дня суседзі пачалі заўважаць каля хаты краўца раскіданую цэглу, скрыню з разведзенай глінай, кучу пяску.

— Печ раблю! — тлумачыў цікаўным Пат.

— То чаму так доўга робіш?

— Няма грошай на цэглу і жалеза...

А на самай справе Ілья, выкапаўшы пад печчу дзірку, амаль паўгода з-пад падлогі выбіраў пясок і кошыкамі выносіў яго за горад. Потым выклаў падвал дошкамі, правёў электрычнасць. Прыехалі з ЦК, паглядзелі, сказалі:

— Добра, Ілья. Цяпер ты не будзеш хадзіць на партыйныя сходы і не маеш права ні з кім гаварыць пра палітыку. Вось табе пароль, чакай пасылкі!

Аднаго разу з Беластоцкага шасэ пад хату краўца пад'ехаў селянін.

— Прымай цвікі! — заявіў ён, абмяняўшыся паролем, і пачаў уносіць у хату акуратна збітыя скрынкі. На кожнай з іх стаяла стандартная марка цвіковага завода. Пакінуўшы «цвікі», селянін паехаў.

Днём прыйшоў яшчэ адзін незнаёмы і разам з Ільёй пачаў даставаць са скрыняў дэталі друкарскага станка і насіць у падвал. Да раніцы ўсё было гатова.

З гэтага дня і пачалося. Ноччу друкавалі, днём жонка — Суля — насіла «прадукцыю» ў горад на рынак. Там ля прылаўкаў яна абменьвалася кошыкам з другой падпольшчыцай.

Ішлі дні, месяцы. гады, а ў доміку на Ласасянскай вуліцы ўсё ішло сваім парадкам. Праўда, суседзі бачылі, што іншы раз да Пата заходзілі незнаёмыя людзі. Ды ці ж мала заходзіць да краўца людзей?

У горадзе бурна развіваліся падзеі, выбухалі забастоўкі, палітычныя выступленні, і толькі Пат маўчаў.

— Як ты можаш так жыць, бы ў скарлупе?— дзівіліся суседзі.

— Няма калі займацца палітыкай,— адказваў кравец,— жыву з іголкі!

Справа яго была цяжкай, небяспечнай. Тых, хто прыходзіў да яго друкаваць, Ілья ведаў толькі па клічцы. Калі таварыш некалькі дзён не з'яўляўся, Ілья ведаў, што ён ужо ніколі не вернецца: праваліўся. Так здарылася з «Юзікам», «Мішам», «Сашай», «Валяй», «Абрашам»... Але, трапіўшы ў лапы дэфензівы, усе трымаліся па-геройску, друкарні не выдавалі.

Паліцыя здагадвалася, што друкарскі станок знаходзіцца ў Гродна. Пачаліся павальныя вобыскі. Аднойчы друкарня выконвала тэрміновы заказ, друкавала лістоўкі для забастоўшчыкаў тытунёвай фабрыкі. Трэба было працаваць і днём. Раніцой, калі Ілья з таварышам былі ў падвале, жонка краўца праз акно ўбачыла сінія мундзіры — ішлі паліцыянты! Суля не разгубілася. На сцяне вісеў ручнік, пад ім была кнопачка. Жанчына націснула кнопачку. У

падвале патухла святло. Увайшлі паліцыянты, абшукалі пакой, заглянулі ў шафу, пад ложак, нават у вёдры, склалі пратакол, далі Сулі падпісаць і пайшлі.

Увечары па вуліцы праходзілі забастоўшчыкі. Ілья стаяў ля сваёй хаты і прагна ўдыхаў свежае паветра. Малады хлапец, размахваючы пракламацыяй, закрычаў:

— Глядзі, з Масквы прыслалі, бачыў?!.

У Ільі стала прыемна на душы. Такія мінуты былі ўзнагародай за трывогу, за непакой пра будучае сям'і, за бяссонныя ночы.

Вельмі цяжка было працаваць Пату ў падполлі. Акрамя таго, сям'я не раз перажывала звычайныя нягоды: нястачу, хваробу жонкі, смерць сваякоў. Але небяспечна было тое, што ў Пата падрастаў сынок. А дзіця дзіцем, магло дзе-небудзь пахваліцца. Аднак усё гэта не адбілася на лёсе падпольнай друкарні. Яна існавала да дня вызвалення Заходняй Беларусі. Пасля Ілья Ісакавіч перадаў яе ў музей.

Ілья Ісакавіч дажыў да светлых дзён, за якія аддалі жыццё яго старэйшыя браты, за якое змагаўся ён сам. Цяпер Пату шэсцьдзесят сем год. Ён яшчэ моцны, бадзёры. Яшчэ зусім нядаўна Пат пакінуў працу ў швейнай арцелі і пайшоў на заслужаны адпачынак. Ён — персанальны пенсіянер.

## III. ГАСПАДАР

Ці былі вы калі-небудзь на Магілянскіх гарах? Не? Шкада!

Вядома, гэта не Каўказ. Аднак і тут снег растае на два, а то і на тры тыдні пазней, чым на палях. У ярах растуць высокія, па пояс, палын, дзікія буракі, свірэпа, шырокая, як асака, трава. У адным месцы, нібы ў сапраўдных гарах, нават прытаілася невялікае азярцо. Тут вы можаце спудзіць не адну лісу і пашкадуеце, што з вамі няма стрэльбы. А калі ўзыйдзеце на самую высокую вяршыню, вы здзівіцеся. Вы пачуеце, як шуршыць у хмарах вецер. Унізе перад вамі адкрываецца вялікая, перасечаная рэчкаю Свіслач, балоцістая раўніна. За ёю — асфальтаванае шасэ Гродна — Берастовіца. Далей — вёскі, вёскі, як кінуць вокам, аж да самага гарызонта, дзе выразна відаць, як дымяць каміны Ваўкавыскага цэментавага завода «Перамога». А гэта ж да яго адсюль па прамой добрых сорак кіламетраў! Налева і направа — таксама вёскі з доўгімі прысадзістымі будынкамі ферм, двух-, а то нават трохпавярховыя школы. Выцягнуліся нітачкі алешын на беразе рэчак. Люстэркамі бліщчаць азерцы. Сінеюць пералескі. Растапырылі свае крыллі ветракі. У адным месцы ледавік пакінуў велізарную, строга сіметрычную гару, быццам насыпаў курган нейкаму казачнаму багатыру.

Калі вам пашанцуе і ў гэты дзень паветра будзе празрыстае, вы ўсё гэта ўбачыце так выраз-на, быццам на далоні.

На ўсходнім схіле каля вашых ног раскінулася вёска Магіляны, адкуль і паходзіць назва гэтых гор. З гэтай вёскі выйшлі чатыры старшыні калгасаў. Пра аднаго з іх — Пятра Іосіфавіча Дзеншчыкава мы і збіраемся расказаць.

## 1

Зямля ў Магілянах — пясчаная, камяністая. На ёй зрэдку расце ядловец.

— Каменні ёсць, ядловец свой, хлеба прыкупіўшы — жыць можна! — калісьці ў жарт гаварылі магілянцы. І дадавалі:—А захацелася яшчэ чаго-небудзь, залезь на гару і глядзі. Чым не курорт?

Чвэрць стагоддзя таму назад на Магілянскіх горах быў авечы выпас. Разам з іншымі хлапчукамі сюды прыганяў свой статак магілянскі хлопчык Пеця — сын Юзіка Дзеншчыкава. Узабраўшыся на вяршыню высокай гары, Пеця глядзеў на палоскі сваёй вёсачкі, яны былі такія вузкія, што драўляная барана адным крайнім зубам чапляла адну мяжу, другім — крайнім — другую. Часамі па дарозе з Алексіч ішоў Пецеў бацька і нёс, прывязаную вяровачкай да пальца, бутэльку газы. Пеця ведаў, што ў бацькі ў кішэні ёсць яшчэ скрыначка запалак за дзесяць грошаў. Бацька ідзе і лічыць: у скрыначцы сорак восем запалак, а калі іх раскалоць папалам — будзе дзевяноста шэсць. Да самай зімы хопіць!

Крыху счакаўшы, па гэтай самай дарозе з Берастовіцы пляцецца фурманка. Гэта едзе дзядзька Адам. Конік Адама такі маленькі, што, здаецца, прывязаны да аглабель, і такі худы, што не разбярэш, дзе дуга, а дзе рэбры. Скура на коніку — быццам паношаная світка, на баках абдзёртая да мяса, уся ў драпінах і струпах. Дзядзька вязе з Берастовіцы падарунак сям'і — бутэльку лёку...

Юзік Дзеншчыкаў вучыў старэйшага сына Мікалая ў Беластоцкай рамесніцкай школе, ускладаў на яго вялікія надзеі і на гэта аддаваў усю гаспадарку. Пеця з малых год ведаў, чаго каштуе кавалак хлеба.

Хлопчык доўга не ўмеў чытаць і пісаць па-беларуску. Бывала, з зайздрасцю глядзіць на старэйшага брата, як той чытае кнігі, бачыць новы свет, усміхаецца яму. А ён, Пеця, павінен кожны дзень глядзець на адну і тую крапіву пад плотам ды на пасечаную калодку з уваткнёнай у яе сякерай. Яму таксама захацелася ўбачыць што-небудзь іншае. Аднаго разу хлопчык узяў звязаны нітачкай з двух палавінак аловак, кавалак тоўстай паперы, у якой маці прывозіла з горада мыла, і стаў выводзіць каракулі. Але ні чытаць, ні пісаць так і не навучыўся. Аднойчы брат Мікалай узяў яго за руку і паказаў, як пішуцца літары.

Прыязджаючы на канікулы, Мікалай апавядаў пра далёкія краіны, пра СССР, пра Днепрагэс. Пеця заганяў авечкі на Магілянскія горы, садзіўся дзе-небудзь у зацемку і марыў. Вось ён, вялікі і дужы, раптам стане інжынерам. Прыедзе ён тады ў Магіляны, перагародзіць плацінай Свіслач, пабудуе электрастанцыю і ўсім вёскам правядзе святло. Навакол вырастуць казачныя белыя дамы, ахутаныя сакавітай зелянінай. Сяляне дзякуюць бацькам за такога сына. Бацькі шчаслівыя і задаволеныя. Эх, як добра адчуваць, што ты зрабіў нешта карыснае людзям!..

Гэта было ў тыя гады, калі Пеця праз кавалачак каляровага шкельца мог паўдня захапляцца светам...

Але Мікалай скончыў школу, не атрымаў работы і вярнуўся дадому. Пецю мінула пятнаццаць гадоў. Абавязкі пасвіць авечак прыйшлося перадаць малодшай сястры, а самому шукаць заробкаў.

Аднойчы Мікалай з Пецем узялі косы і пайшлі ў суседнюю вёску Круглікі да памешчыцы Пачобут наймацца касіць. Мікалая пані забракавала адразу. Слабыя Пецевы рукі пакінулі на пракосе грыву, пані заўважыла гэта і прагнала яго з сенажаці. Гэтак скончыліся пошукі работы.

У малодшага Дзеншчыкава пачала прабуджацца свядомасць дарослага чалавека. І Пеця адчуў на сваім жыццёвым шляху такую пера-шкоду, пераадолець якую было гэтак немагчыма, як прабіць галавой скалу. Старэйшыя сябры абнадзейвалі:

- Пачакай, брат, мы яшчэ сваё возьмем!..

У Магілянах дзейнічала падпольная камсамольская арганіза-цыя, Пятро ўступіў у яе. У глыбокай канспірацыі ён збіраў сродкі на МОПР (Міжнародную арганізацыю дапамогі рэвалюцыянерам), на падтрымку іспанскіх рэспубліканцаў, біў вокны здраднікам, хаваў тых, каго шукалі паліцыянты, вадзіў ноччу людзей на Магілянскія горы для сустрэчы з кіраўнікамі падполля.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі Пятро збіраўся паступіць у школу, выношваў новыя планы, але ўсё абарвала вайна, і ён пайшоў на фронт.

Летам 1952 года жыхары суседніх з Магілянамі вёсак выбралі старшынёй узбуйненага калгаса імя Сталіна, дэмабілізаванага з арміі, Пятра Іосіфавіча Дзеншчыкава. Між іншым, калгасу перадалі і зямлю памешчыцы Пачобут.

## 2

Ад мінулых часоў засталася спадчына. Жыхары тутэйшых вёсак верылі ў розныя прымхі і забабоны. Іншы селянін, асцерагаючыся якога-небудзь ашуканства, адмаўляўся падпісацца на-ват на паштовым бланку! У некаторых хатах віселі дошчачкі з выбітым сучком: праз яго цадзілі малако, гэта, па разуменню

тутэйшых цётак, прыбаўляла надоі карове. Няўдалае вядзенне арцельнай гаспадаркі папярэднікамі новага старшыні зарадзіла ў людзей абыякавасць да калгасных спраў.

Набліжалася першая веснавая сяўба. Не было гною. Новы старшыня на праўленні прапанаваў: пакуль яшчэ падмерзлае балота трымае, на поле навазіць торфу! Усе ведалі добра, колькі трэба торфу для адной гаспадаркі. Таму раней яго нават і не вазілі. Хіба можна ўдабрыць усё калгаснае поле? І таму на прапанову старшыні толькі ўсміхаліся. А нехта проста заявіў:

— Пра гэта толькі хараша чытаць у кніжках! Жывёле былі патрэбны фермы, і новы старшыня з вялікай цяжкасцю дастаў пілараму. У той час па вёсцы ездзіў зборшчык утыльсыравіны і мяняў усякі тавар на жалеза. І Дзеншчыкаў пачуў, як хтосьці з натоўпу сказаў:

— Ну, цяпер будзе што нашаму магілянцу мяняць на папяросы!

Нават вестка аб тым, што сельгасарцелі выдзелена аўтамашына, была прынята без усякай радасці. А некаторыя нават упікнулі:

— Во цяпер будзем на яго працаваць, а ён сабе — катацца.

Прыкра і балюча было слухаць такія заўвагі ад людзей, якім Пётр Іосіфавіч з першых дзён працы аддаў усе свае сілы. І толькі разуменне таго, што гэтыя людзі ні ў чым не вінаватыя гаротнікі, якія так доўга не маглі выйсці з адвечнай цемры, дадавала старшыні сілы не кідаць пачатую справу. Пётр Іосіфавіч аднёсся да людзей добразычліва і з душой, без крыўды, ён адчуў у сабе прызванне вывесці іх на дарогу.

Па прыкладу сваіх Магілян, Дзеншчыкаў ведаў, што ў вёсцы заўсёды ёсць некалькі сялян, да якіх прыслухоўваюцца ўсе і лічацца з іхняй думкай. Разам з сакратаром партарганізацыі ён павёў справу так, што менавіта з такіх людзей было выбрана праўленне і брыгадзіры.

Многа значыць асабісты прыклад. Пазнаёміўшыся са старшынёй бліжэй, члены праўлення і брыгадзіры адчулі ў ім сумленнага, клапатлівага работніка і чалавека. Гэта прымусіла людзей прыслухоўвацца да Дзеншчыкава. Такім чынам пазіцыі новага старшыні крыху ўмацаваліся. Прыроднае чуццё падказвала Пятру Іосіфавічу розныя падыходы да людзей: да аднаго з ласкай, да другога з просьбай, трэцяга трэба было ў час пахваліць, а чацвёртага і прымусіць. Справа крыху пайшла.

Аднак вынік першай восені быў вельмі ж нязначны. Калгас пасеяў з паўтара гектара цукровых буракоў, далі яны па... шэсцьдзесят цэнтнераў з гектара, а для ўборкі прыйшлося... наймаць людзей з іншых калгасаў.

З'явіліся цяжкасці нават там, дзе іх ніяк нельга было чакаць.

Каля вёскі Пракаповічы з пакон вякоў ляжала бясплоднае тарфяное балота. Яшчэ ранняй вясной старшыня вырашыў яго ўзараць, спа-дзеючыся, што да зімы на ім вырасце добрая трава. Трактарысты балота ўзаралі ледзь не на метр глыбінёй. Але на ім да зімы не паказалася ні адна травінка, ворыва засталося ляжаць мёртвым пластом.

— Чаго вы хочаце — гэта ж магілянец! Ён зроду не бачыў балота, а толькі горы,— смяяліся нядобразычлівыя людзі.

Але гэтакіх цяпер засталося куды менш. У сялян пачала прабуджацца цікаўнасць: а і на самай справе, чаму так здарылася? І яны ж раней думалі, варта толькі бясплоднае балота ўзараць, як адразу пачне расці трава. І самі не рабілі гэтага толькі таму, што не хапала сілы!..

Вясной калгас пасадзіў шмат бульбы. Яна ўрадзіла. Гэта адразу падняло жывёлагадоўлю. Каровы павялічылі надоі. Адкормленыя свінні далі прыбытак. У банку на калгасным рахунку з'явіліся першыя зберажэнні, павялічыўся працадзень, і ў калгаснікаў памацнела ўпэўненасць: працуй як след, твая праца не прападзе! Згуртавалася група актывістаў, якую ўзначальвалі брыгадзіры. З гэтай групай старшыні было ўжо лягчэй рыхтавацца да новай вясны.

3

І ўсё ж такі старшыні за цэлы год удалося актывізаваць толькі невялікую частку калгаснікаў. У гэтым ён пераканаўся, калі па беразе Свіслачы пачалі хадзіць інжынеры з рознымі вымяральнымі прыборамі. Яны выбіралі месца для электрастанцыі. Збывалася мара маленькага Пеці, вынашаная яшчэ на Магілянскіх гарах. Але на яго вялікую крыўду ў калгасе імя Сталіна толькі дзесятая частка калгаснікаў згадзілася правесці святло ў свае хаты.

— Патрэбны нам гэтыя выдумкі, як карове пятая нага!..

— Яшчэ маланка вёску спаліць. Дайграецца гэты магілянец...— бурчалі многія і нізавошта не хацелі ісці на будаўніцтва плаціны.

Тым часам Дзеншчыкаў разам з праўленнем рыхтаваўся да вясны. Гной і торф у час вывезлі на поле. Не давалі спакою Індурскай МТС. Наладзілі агранамічную вучобу калгаснікаў. Адрамантавалі інвентар. Добра памог старшыні сакратар калгаснай партарганізацыі малады заатэхнік Аляксей Анісімавіч Шах.

Клопаты не пайшлі на марна. Другі год скончыўся лепш: на працадзень прыйшлося па два кілаграмы збожжа, па тры — бульбы, па два з паловай рублі грашыма. Нават цукар выдалі на працадзень. Гэта адразу змяніла атмасферу ў калгасе. Наетупіў круты перадом. Калгаснікі пачалі настойліва патрабаваць у брыгадзіраў:

— Дай работы!

Між іншым, у той год адна брыгада пасеяла шаснаццаць гектараў буракоў, а сабрала, вядома, сваімі сіламі па чатырыста цэнтнераў з гектара.

Абудзіліся нават старыя. Сямідзесяцігадовыя бабка Раманоўская і дзед Юляк Вярышка аднаго разу паскардзіліся старшыні:

— Чаму твае брыгадзіры нам нічога не даюць? Хочам і мы працаваць!

Прыйшлося бабку паслаць да куранят, а дзеду даручылі рабіць венікі і граблі. Абое за год выпрацавалі па 350 працадзён.

4

Зімою электрыфікавалі фермы. Быццам рушыў з месца зляжалы лёд. Электрычнасць правялі да сябе ў хаты ўсе калгаснікі, а неўзабаве ніхто нават не ўяўляў, як гэта можна жыць без электрычнасці.

Тады сталі задумвацца, які ўпарты і надзейны чалавек іх новы старшыня. Яны ж не верылі, упіраліся, пасмейваліся з яго намаганняў, нават злараднічалі, а ён цвёрда рабіў сваё.

— І свайго такі дабіўся!—прызнаваліся яны.

— Залаты чалавек! — з удзячнасцю дадавалі другія.— І не злапамятны!

— Сапраўдны камуніст! — з радаснай гордасцю заяўлялі трэція.

Так зацвярджаўся непахісны аўтарытэт старшыні Дзеншчыкава. Ва ўсіх калгаснікаў з'явілася цвёрдая вера ў тую справу, якой ён кіраваў.

Дзеншчыкаў прыадкрыў перад імі заслону той будучыні, аб якой дарэмна марылі дзесяткі пакаленняў. Калгаснікі дружна ўзяліся за працу.

Восенню, у час разліку з калгаснікамі, толькі адзін сельмаг у вёсцы Пракопавічы прадаў сорак шэсць радыёпрыёмнікаў!

Калгас стаў мільянерам.

Калісьці масіўныя памешчыцкія пабудовы сялянам здаваліся вяршыняй гаспадарчай дасканаласці. Цяпер наяўнасць сродкаў дала магчымасць пабудаваць фермы настолькі лепшыя за памешчыцкія, наколькі тыя калісьці былі лепшыя за ўбогія сялянскія хлявы з вышчаранымі рэбрамі латаў.

**5**

Многа клопатаў у старшыні калгаса. У жніво Дзеншчыкаў бывае дома не болей пяці — шасці гадзін у суткі. У пяць гадзін раніцы ён ужо праводзіць нараду брыгадзіраў.

Вось сабраліся яны.

— Трэба малаціць лубін. Не рана яшчэ, як вы думаеце?—пытае старшыня.

— Пара. Каб толькі не пабіў камбайн...— заклапочана кажа брыгадзір.

— Заўтра трэба паслаць дзве машыны па цэмент.

— А калі пашлём адну ў два рэйсы, а другую пакінем дома вазіць угнаенні на палі? — перабівае старшыню другі.

Усе згаджаюцца. Трэці ўстаўляе:

— Я думаю гной сёння прыворваць.

— Толькі тоненька, глядзі! А торф — лушчыльнікам,— раіць сусед.

— А табе трэба паслаць дваццаць чалавек на водаправод.

— Паслаць то пашлю, але хто яго ведае з гэтым водаправодам,— чэша патыліцу брыгадзір.— Вада з рэчкі, а летам у ёй столькі мікробаў...— Аднак, сустрэўшыся позіркам са старшынёй, відаць, успомніў мінулае, бо паправіўся:—Праўда, цяпер і на мікробаў управа ёсць...

І калі прыглядзецца, прыслухацца да гэтай нарады з боку, нават не падумаеш, што тут штаб вялікай шматгалінней гаспадаркі. Быццам сабраліся радавыя, паважаныя людзі і спакойна, не спяшаючыся размаўляюць, спрачаюцца, а то і кідаюцца з'едлівымі словамі. Не вылучаецца сярод гэтых вусатых дзядзькоў і нізкарослы Дзеншчыкаў. Але пад знешнім спакоем і вытрымкай у гэтым чалавеку адчуваецца разумны і тонкі псіхолаг, цвёрдая воля камуніста.

Кіраўніцтва калгасам — справа творчая. А на творчасць здольны толькі людзі таленавітыя. Такім і аказаўся Дзеншчыкаў. Узаемная павага, давер'е, сумленнасць — вось якую атмасферу яму ўдалося стварыць сярод брыгадзіраў калгаса.

Гэтыя людзі бываюць і строгімі, калі трэба. Кошт працадня ў калгасе роўны прыкладна трыццаці рублям. Самым цяжкім пакараннем цяпер стала рашэнне праўлення спісаць з вінаватага некалькі працадзён. Гэта датычыць і членаў праўлення. Калі хто-небудзь з іх спазняецца на пяць хвілін, усе аднагалосна выносяць рашэнне аб штрафе. Аднойчы на праўленне спазніўся і сам старшыня. Тады нехта прапанаваў:

— Спісаць з Дзеншчыкава пяць працадзён!

Што ж, прыйшлося і ініцыятару такога парадку прагаласаваць і пакараць самога сябе на сто рублёў!

З самага пачатку сваёй дзейнасці Дзеншчыкаў дабіваўся, каб яго калгасная гаспадарка развівалася не аднабакова. Першы год ён думаў: «Ну, даб'юся вось гэтага, а там пойдзе лепш, адпачну». А дабіўшыся аднаго, ён ставіў перад сабой новую мэту. Калгас расце. Павялічваецца з кожным годам і аб'ём работ. Колькасць машын і

трактараў пачалі лічыць ужо на дзесяткі. З'яўляюцца ўсё новыя і новыя клопаты.

Пабываў старшыня ў славутага агранома Мальцава. Той падказаў яму, чаму ўзаранае балота трэці год ляжыць мёртвым пластом: пры ворыве самы карысны слой балота загналі на метравую глыбіню. Цяпер старшыня для праверкі вопытаў Мальцава адвёў трыццаць гектараў.

У калгасе да гэтага часу не было добрага клуба, прыгожага школьнага будынка. І гэтым цяпер заклапочаны Дзеншчыкаў.

## 6

Ідзе сяўба. Раптам чуткае вуха старшыні ўлавіла, што на полі змоўкла грукатанне трактара. Дзеншчыкаў сеў на каня і паімчаў да машыны.

— Задні мост перагрэўся! — разгублена паведаміў трактарыст.

Давялося зараз жа дапамагчы механізатарам.

Вяртаючыся з поля, Дзеншчыкаў заглянуў на птушнік. Там у гусятніцы Вольгі Пытлевіч свая бяда. Для гусак-нясушак нядаўна зрабілі спецыяльныя гнёзды. Думалі, усё будзе добра, ды не ведалі гусінае пароды. Гусакі, як выявілася, лішне клапатлівыя «мужы». Ходзяць яны парамі. Прывядзе ў гусятнік гэткі раўнівец сваю «жонку», пасадзіць на гняздо, стане ў дзвярах і нікога больш не пускае. Іншыя «мужы» скубуць яго так, што пух, нібы снег, лятае ўсюды, а ён не здаецца і горда стаіць на варце.

Дробязь? Гусі раскідаюць яйкі па полі, а гэтага толькі і чакаюць каршуны. Смех і гора!

А вось сакратар партарганізацыі прыйшоў параіцца. Працавітая дзяўчына Л. угаварыла сябе, што яна вельмі непрыгожая і ніхто не возьме яе замуж. Начытаўшыся рэлігійных кніжак, вырашыла пайсці ў... манастыр. Хто б падумаў, што такое яшчэ ў нас бывае?!

Заможнасць сяла можна пазнаць адразу, не заходзячы ні да каго ў хату. Вось вёска Пракопавічы. Усе хаты адрамантаваны. Каля хат новыя платы. Над стрэхамі пераплятаюцца электраправады, антэны. Каля лесапілкі акуратна выстраілася аўтакалона. На вуліцы поўна веласіпедыстаў: едуць у школу дзеці, коціць паштальён, кудысьці спяшаецца медсястра.

У адным двары рамантуюць трактар. Дзеці абступілі механіка, просяць:

— Дзядзечка, пусціце ў кабіну, дайце патрымацца за рычагі!

— А двойкі ўчора не атрымаў?

— Не... тройку!

— Э-э, брат! Ну добра, лезь. Наступны раз буду пускаць толькі тых, у каго не менш чацвёркі, зразумела?

— А-га!..

З калгаснага двара выскачыла двухтонка. Яе спыняе пажылая калгасніца:

— Мне ўсяго два кіламетры!—апраўдваецца. Шафёр не здзіўляецца і дазваляе сесці. Павялося так: трэба цётцы ў суседнюю вёску, інакш як на машыне яна неможа туды дабрацца.

І ўвесь гэты малюнак сённяшніх Пракопавіч неяк гарманіруе з вясеннім сонцам, з песняй жаўрукоў, з бусламі, якія ляцяць над вё'скай, несучы ў дзюбах свой будматэрыял, пругка і важна махаючы крыллямі.

Асабліва прыгожыя Пракопавічы, калі на іх глядзець з Магілянскіх гор. Нібы дачны гарадок, раскінуліся яны ўздоўж асфальтаванага шасэ. І няцяжка сабе ўявіць пачуцці камуніста Пятра Дзеншчыкава, які адчувае, што ў змяненні ўсяго ўклада жыцця гэтых некалі з пакалення ў пакаленне гаротных людзей ёсць і яго доля. Так збываюцца яго даўнія мары.

## IV. ПРАЦАВІТАЯ СЯМ'Я

### 1

Пасля першай сусветнай вайны ў глухую вёску Рагозінцы з эвакуацыі вярнуўся селянін. Ен прывёз маладую жонку-грузінку. Бедная не магла перанесці зняваг і пагарды забабонных родзічаў мужа і неўзабаве памерла, пакінуўшы маленькую дачку Севярыну. Сірату ўзялі на выхаванне сваякі. Дзяўчынка падрасла, але моладзь яе старанілася.

Па суседству з апекунамі Севярыны жыла малазямельная сям'я Гецольдаў. Сын Гецольда Лёнгін пакахаў дзяўчыну з грузінскімі рысамі твару. Тая адказала ўзаемнасцю, і яны пажаніліся.

Гецольду дастаўся ад бацькі кавалачак зямлі. Звычайна з такіх гаспадарак людзі ўцякалі ў горад, множылі там рады беспрацоўных, але маладажоны засталіся на сваёй зямлі.

Лёнгін, як ніхто іншы ў вёсцы, любіў і разумеў прыроду. Нягледзячы на малапісьменнасць, ён захапляўся сельскагаспадарчай літаратурай. Яму нават удалося прачытаць на польскай мове Мічурына. І хутка Лёнгін на сваім кавалачку зямлі пачаў тварыць цуды. Буракі ў яго на агародзе выраслі па чатырнаццаць кілаграмаў, памідоры — па васемсот грамаў, гарбузы — па пуду!

Але гародніна ў тыя часы збыту не мела. Сям я ўсё большала, і жанчына з трывогай думала: што будзе з яе дзецьмі?..

## 2

Скончылася Айчынная вайна. Севярына, як мнагадзетная маці, стала атрымліваць дапамогу. А калі ў 1952 годзе ў вёсцы арганізоўваўся калгас імя Дзяржынскага, Лёнгіна выбралі звеннявым па тытуню, і ён горача ўзяўся за справу. Яму стала дапамагаць жонка. Гецольды выдатна апрацавалі зямлю, і ўчастак даў добры ўраджай тытуню. Настрой у калгаснікаў падняўся. Але хутка людзі пачалі гаварыць пра свайго старшыню:

— Ён спачатку скажа або зробіць, а тады ўжо падумае...

У гэтым пераканаўся і Гецольд. Аднойчы Лёнгін звярнуўся да старшыні калгаса Храмакова з прапановай:

— Я думаю разам з тытунём вырошчваць пладовыя дрэўцы. Закладзём калгасны садок!

— Не трэба! — пачуў Гецольд у адказ.— У Чарлёне ёсць пітомнік. Там і купім.

Да гэтага часу Севярына гадавала ўжо дзевяць дзяцей. Лёнгін паставіў на ногі ўсё сваё шматлікае сямейства і разам з другімі членамі звяна вывез пяцьсот вазоў гною і торфу, апрацаваў зямлю, вырасціў расаду і ўжо збіраўся садзіць тытунь. Ды ўчастак звяна спадабаўся старшыні Храмакову, і ён заявіў, што забірае яго пад іншыя культуры.

— А ты сабе возьмеш поле, якое летась было пад жытам. Нічога, апрацуеш. Ты на гэта майстра! — не без насмешкі сказаў Храмакоў.

Вельмі крыўдна было, вельмі, але Лёнгін здаўся. Затое не здалася Севярына. Яна хадзі-. ла ў райцэнтр і звярнулася ў райком партыі.

Сакратар Мастоўскага райкома Дайнека яе ўважліва выслухаў і паабяцаў дапамагчы, а на развітанне сказаў:

— Калі зноў будзеце бачыць такую несправядлівасць, звяртайцеся да мяне. Заўсёды дапамагу!

І сапраўды, Храмакоў атрымаў вымову. Але, калі бура над яго галавой сціхла, ён зняў Гецольда з пасады звеннявога.

Каб не надакучаць і не турбаваць начальства. Севярына скардзіцца болей не пайшла. Ды і ёй здавалася, што тут справа датычыць не грамадскіх інтарэсаў, а чыста асабістых — яе і Лёнгіна. Ім толькі ўдалося пакінуць за сабой участак, плошчай у адзін гектар, які апрацавалі сіламі сваёй сям'і. Участак даў трыццаць сем цэнтне,- раў з гектара. За гэта сям'я атрымала ад Галоўтытуню дзесяць тысяч рублёў!

Але не абышлося і тут без скандала са старшынёй. Адначасова з тытунём Гецольды даглядалі тры гектары капусты. Ураджай чыстых качаноў дасягнуў рэкорднай лічбы — дваццаць дзве тоны. Храмакоў распарадзіўся гэтую капусту пусціць на сілас. На шчасце, пра гэта да-

ведаліся ў райцэнтры. Калгас быў вымушаны прадаць капусту спажывецкай кааперацыі.

## 3

Усю зіму Гецольд рамантаваў калгасу вазы, сані. Нарабіў шмат парніковых рам. Марыў зноў вырошчваць тытунь, але для гэтага патрэбна было сабраць вялікую колькасць гною. З практыкі Лёнгін ведаў, што адно парася за год можа даць да трох тысяч літраў гнаявой жыжкі, пабудаваў хлеў так, што з-пад свіней жыжка па бетонных жалабках сцякала ўсю зіму ў бункер. Кароў падсцілаў пасечанымі тытунёвымі бадылямі. Кожны дзень зграбаў гной у кучы, перамешваў яго з торфам. І калі ранняй вясной райвыканком Гецольду прапанаваў для тытуню ўчастак у паўтара гектара, ён згадзіўся.

Гецольды дружна ўзяліся за справу. Праўда, уся складанасць была ў тым, што дзеці яшчэ вучыліся ў школе, але і гэта не перашкодзіла.

Рэдка сустрэнеш расліну, якая б патрабавала столькі працы, як патрабуе яе тытунь. На сваім участку сям'я Гецольдаў уласнымі рукамі пасадзіла семдзесят пяць тысяч саджанцаў! Працавалі ўсе. Стараліся і самыя меншыя: шасцігадовыя Крыстына і Ірына, сямігадовы Уладзімір і васьмігадовая Аліцыя. Не адставалі ад іх і іншыя браты і сёстры, якія, вярнуўшыся са школы і падрыхтаваўшы ўрокі, спяшаліся на дапамогу.

Каб тытунь добра рос, дзеці трэсачкамі ўзрыхлялі пад саджанцамі зямлю. Калі выпадаў дождж — пад кожны кусцік вылівалі па чатыры літры гнаявой жыжкі. Потым абломвалі расткі, зачахлыя лісточкі.

Тытунь — дзіця сонца, а вясна зацягнулася. Але ў цёплыя ліпеньскія дні расліны пачалі набіраць сілы. Тытунь на ўчастку Гецольдаў падняўся густою сцяной. Расліны былі такія сакавітыя, што, здаецца, праткні ліст чым-небудзь вострым, і з яго пырсне зеляніна. Лісты выраслі да незвычайных памераў: па шэсцьдзесят сантыметраў у шырыню і семдзесят у даўжыню!

— Пад адным такім лістом можна ад дажджу схавацца! — захапляліся экскурсанты.

Пакуль дзеці разам з маці ўраблялі плантацыю, Лёнгін рыхтаваўся да збору лісця. Гэта ж трэба было сабраць і высушыць семдзесят пяць тысяч кілаграмаў зялёнай масы! Для сушэння тытуню Гецольд прыстасаваў усе дахі і навесы сваіх будынкаў, зрабіў спецыяльныя стрэхі, дзе павінна было вянуць свежае лісце. Каб высушыць увесь тытунь, трэба было мець дзесяць тысяч метраў шпагату!

Надышоў час ломкі тытуню. Дарасламу нельга было праціснуцца між радкоў, каб не пашкодзіць раслін. Лісце выбіралі самыя малодшыя Гецольды. Сярэднія — падносілі і нанізвалі яго на

шпагат. Бацька і маці ледзь паспявалі развешваць шнуры. Асабліва цяжка даводзілася вучням — Яўгену, Станіславу, Аліцыі і Софіі. Гэта яны сваімі пальчыкамі нанізалі лісток да лістка дзесяць кіламетраў шпагату.

У кастрычніку Гецольды адправілі на нарыхтоўчы пункт чатыры грузавыя машыны запакаванага ў стандартныя цюкі тытуню — амаль шэсць тон. Дзевяноста працэнтаў пайшло першым сортам. Адзін гектар даў трыццаць восем цэнтнераў замест пяці па плану!

Бухгалтэрыя калгаса імя Дзяржышскага выдала Гецольдам адных прэміяльных трыццаць тысяч рублёў і дзвесце кілаграмаў цукру! Працавітая сям я за тысячу трыста працадзён атрымала яшчэ прадукты і грошы.

4

Сям'я Гецольдаў атрымлівае вялікі прыбытак ад калгаса ўжо не першы год. Акрамя таго, сельсавет кожны месяц плоціць Севярыне дапамогу па шматдзетнасці. Цяпер яе сыны і дочкі ездзяць у школу на веласіпедах. Дзіцячыя мары цяпер займае матацыкл з каляскай, на куп-лю якога ўжо маецца рашэнне «сямейнага савета».

...У кабінет старшыні Мастоўскага райвыканкома Чудзінава ўваходзіць па-гарадскому апранутая жанчына. У яе вялікіх цёмных вачах свеціцца розум. Гэта — Севярына Гецольд.

— Я хачу,— кажа яна,— каб райспажыўсаюз прымаў у мяне асабістыя заказы на паліто, на абутак для дзяцей. Няўжо мне дзеля гэтага трэба ў Гродна ехаць?..

Старшыня абяцае дапамагчы і запрашае Севярыну выступіць на сходзе калгаснікаў адной сельгасарцелі, падзяліцца вопытам.

Вечарам, калі Севярына апавядала на сходзе аб сваёй рабоце, Чудзінаву давялося пацвердзіць, што ў яе сапраўды дзевяць дзяцей і гэта не перашкаджае ёй працаваць у калгасе.

Такія людзі, як Гецольды, ніколі не супакойваюцца на дасягнутым. Лёнгіна хвалюе, чаму гэтакага ўраджаю, як у яго, не змаглі дасягнуць ва ўсім кэлгасе. З болем у сэрцы гаворыць ён пра непаладкі:

— Як тут быць спакойным? Зямля ў нас самая лепшая ў раёне, а калгас — горшы!

На этажэрцы ў Гецольда стаяць творы Мічурына, «Энтамалогія», часопіс «Сад і агарод»... Паказваючы сваю бібліятэку, Лёнгін гаворыць:

— Нядаўна я вычытаў, што насенне тытуню — спажыўны корм для птушкі. Пачаў даваць сваім курам. Ім, відаць, спадабалася.

Цяпер у калгасе новы старшыня, які змяніў нядбайнага Храмакова. І Лёнгін марыць:

— Я са сваёй сям'ёй у гэтым годзе даў калгасу сорак тысяч рублёў прыбытку! Калі б кожная сям'я дала хоць палову гэтага, якія мы ўсе сталі б багатыя! Са сваёй соткі я збіраю тону морквы або памідораў. Васемнаццаць вішань таксама далі тону ягад. А ў мяне зямля не лепшая, чым ва ўсім калгасе! — І дадае:— Эх, як мы зажывём, калі ўсе возьмемся за справу па-сапраўднаму!..

## V. СТРУБНІЦКІ КАВАЛЬ

У кузні, нібы ў клубе, заўсёды людна, ідуць ажыўленыя дыскусіі. Пад сталёвы перазвон кавадла і мернае гудзенне горна, пакуль рамантуецца воз ці куецца конь, можна закурыць і перакінуцца навінамі. У кузні цёпла, зацішна.

З агульнага правіла не выключаецца і струбніцкая кузня ў калгасе «Чырвоная звязда», Мастоўскага раёна. Кавалём там працуе камуніст Іван Антонавіч Міхальчук, або дзядзька Іван, як яго проста завуць на вёсцы.

У дзядзькі Івана — шырокі лоб, тонкія бровы. Скура на твары ў яго смуглая, апаленая агнём з гарніла, дзе-нідзе ў сініх крапінках — гэта ад акаліны. Пад прамым носам у каваля — пышныя, цёмнарусыя вусы, у якіх яшчэ няма ніводнага сівога валаска, хоць у дзядзькі Івана ўжо сямёра дзяцей і старэйшая дачка даўно замужам.

Не, не вусамі славіцца струбніцкі казаль. І не кавальскай сілай. Іван невысокага росту, шчуплы целам, і той сіле няма адкуль брацца. Аднак, калі зацісне між кален конскую нагу, ні адзін стаеннік не кранецца з месца. Распаленыя жалезныя штабіны ён куе так, што яны, як жывыя, даўжэюць на кавадле. Цяжкім молатам Іван лёгка выстуквае тоненькія вухналі. У яго руках пругкае жалеза робіцца эластычным, нібы гума.

У кузні ўсё робіцца пад рытм. Калі дзядзька Іван трымае абцугамі жалеза, два яго спадручныя — Шэйна і Бародзіч б'юць малаткамі. І хто не прыйшоў бы ў гэты момант у кузню, ні каваль, ні спадручныя не азірнуцца, не парушаць такта. Ды і ты сам не адважышся ім перашкодзіць.

Бывае, што дзядзька Іван на хвіліну парушае агульны парадак. Гэта тады, калі яго дзесяцігадовая Люба нясе з пошты газету. І якая б пільная работа ні была, Іван разгортвае газету і садзіцца на кавадла. Усе закурваюць, а дзядзька Іван уголас чытае.

А потым пачынаюцца спрэчкі. Дакурыўшы, каваль важна што-небудзь пацвердзіць, утопча акурак у пясок і зноў бярэцца за абцугі. І праз хвіліну з кузні даносяцца такія пераборы малаткоў, што жанчыны, якія полюць лён, падымаюць галовы і кідаюць адна другой праз загон:

— Ой, ліха на іх, нават польку выбіваюць!

Калгас не купляе восей. Міхальчук рэстаўрыруе старыя, робіць новыя. Кузня забяспечыла акоўкай параконныя вазы.

Даўно мінуў той час, калі вясковы каваль толькі ведаў, як наварыць сашнік да плуга, зрабіць серп, матыку, ды яшчэ дзесятак-другі нескладаных рэчаў. На вёску прыйшла тэхніка, і цяпер прафесія каваля спалучаецца з прафесіяй механіка і слесара.

Аднаго разу Міхальчук ішоў каля РТС і ў звалцы старога жалеза заўважыў тры іржавыя карпусы ад жняярак.

— Дайце нам іх, усё роўна, бачу я, яны вам не патрэбны!— прыстаў Іван да дырэктара РТС.

— Гэтыя іржавыя камы? — здзівіўся дырэктар.— Бяры, калі маеш ахвоту іх валачы!

І ў калгасе «Чырвоная звязда» з'явіліся яшчэ тры новыя жняяркі.

* * *

Жніво. З поля да кузні скача верхам пасланец.

— Дзядзька Іван, у нас жняярка стала. Палявое кола зляцела!

Міхальчук, быццам доктар хуткай дапамогі, бярэ інструменты, сядае ў «Пабеду».

— Тата, вазьміце з сабой на дарогу! — гаворыць дачка і клапатліва кладзе ў рукі бацьку вузялок з ежай.

Машына паімчала ў поле.

Праз некалькі хвілін ужо тупаў ля жняяркі і бурчаў на сваіх памочнікаў каваль.

— Гаварыў жа яму: дай мокрую акаліну, дык не...— дражніць Іван спадручнага.— Вось цяпер і танцуй тут...

А праз нейкі час зноў мерна стракочуць і весела махаюць жоўтымі крыллямі жняяркі, а з кузні даносяцца срэбныя пераразвоны малаткоў.

Дзесьці за тысячы кіламетраў на ўсход ад Мастоў будуюцца домны, узнімаецца цаліна, плаціны перапыняюць сібірскія рэкі. Рамантыка нязведаных краёў вабіць моладзь. Вабіць яна і семярых Міхальчуковых дочак.

— Паедзем і мы, тата! —кажуць яны бацьку.

Старому і тут добра. Але ж ён разумее маладых і ўсё часцей задумваецца. Уласна кажучы, усюды свой край, усюды трэба працаваць, а змена ў струбніцкай кузні ёсць...

## VI. АДКАЗНАЯ ПРАФЕСІЯ

### 1

Вялікай дакладнасцю павінен валодаць бухгалтар. Веданне псіхалогіі людзей патрэбна педагогу і пісьменніку. Цяжка ўявіць

інжынера, які не цікавіцца навінкамі тэхнікі. Бязмерная самаадданасць патрабуецца ад абаронцы Радзімы. Але таму, хто прысвяціў сябе медыцыне, прафесія ўрача прад'яўляе ўсе гэтыя патрабаванні адначасова.

Разнастайная праца медыка: зубному ўрачу, напрыклад, не абавязкова ведаць усе асаблівасці радыкуліту, а псіхіятру — умець цягнуць зубы. Але хірургу трэба быць і неўрапатола-гам, і педыятрам, і тарапеўтам, і аталарынголагам, і стаматолагам, і анатомам.

У тых, хто прайшоў суровае выпрабаванне вайны з імем хірурга звязаны ўспаміны аб чалавеку ў белым халаце са стомленым ад бяссонніцы тварам і ўпартым бляскам у вачах, аб тых, хто спяшаў выратаваць раненага, не раз з небяспекай для ўласнага жыцця. Нямала такіх урачоў працуе і ў мірныя дні.

Такім урачом і з'яўляецца хірург 1-й гродзенскай бальніцы Уладзімір Юсцінавіч Міронччык.

## 2

— Ой, дзяўчынкі, баліць! — раптам крыкнула падносчыца Надзя Леваноўская, выпусціла з рук цагліны і скорчылася.

— Чаго ты мучышся? — схіліліся над дзяўчынай сяброўкі.— Чаму ты не сходзіш да доктара Міронччыка! Ён аднаму чалавеку выразаў тры чвэрці страўніка, і той адчувае сябе вельмі добра!

Лёгка ім, здаровым, раіць, куды ісці, і разважаць аб чужых страўніках, але хіба лёгка адважыцца на аперацыю!

Аднак неўзабаве Надзя адчула такі боль, што ўжо не заўважыла, як сяброўкі панеслі яе да карэты хуткай дапамогі.

І вось яна ў 1-й гарадской бальніцы.

Надзі здаецца, што сцены палаты паблісквають неяк холадна, а сёстры ў белых халатах пазлядаюць на яе чамусьці падазрона.

З суседніх ложкаў «новенькую» не без цікавасці разглядаюць «старажылы» палаты. Тумбачкі каля іх завалены пячэннем, яблыкамі. Толькі яе яшчэ пустая... Пахне лякарствамі, нібы ў аптэцы.

— Што, да доктара Міронччыка на аперацыю?—спагадліва пытаецца ў яе пажылая жанчына.

— Ага,— ледзь шэпча Надзя.— Апендыцыт... Дзяўчына няспрытна садзіцца на край ложка, спрабуючы зашпіліць непрывычна шырокую піжаму. Яна толькі цяпер пачынае разумець, дзе яна і што з ёю. Прыступ прайшоў, і Надзі здаецца, што яна зусім здаровая. Але з галавы не выходзіць трывожная думка аб аперацыі. Робіцца страшна. Дзяўчыне хочацца ўцячы адгэтуль.

— Ды ты не хвалюйся!—супакойвае дзяўчыну суседка.— Хутка абход, і доктар Міронччык зойдзе ў палату.

Загаварылі і другія хворыя. Надзі палягчэла.

Нарэшце ў калідоры пачуліся мяккія крокі і шастанне накрухмаленых халатаў. Нечы мужчынскі голас пытаецца:

— Уладзімір Юсцінавіч, вы мяне заўтра адпусціце дамоў?

— А як жа! — бадзёра і ўпэўнена чуецца ў адказ.— Хопіць у нас месца займаць! Вы толькі паглядзіце на яго, якія вусікі адгадаваў! Ці не жонцы сюрпрыз? — смяецца ўрач. І раптам заклапочана звяртаецца да некага яшчэ: — А вы, бацька, чаго так рана ўсталі? Вам трэба ляжаць і есці больш!

— Я ляжу, пане доктар, я ляжу і ем! — чуецца вінаваты старэчы голас з прыкметным польскім акцэнтам.

— Ідзіце і зараз жа кладзіцеся!—загадвае ўрач. Потым ласкава, але значна:— А ты, Коля, не драпайся, а то будзе твар, як у тых, хто воспай перахварэў, бачыў такіх? У-у, бадзяга ты,— смяецца ён спагадліва.— Нябось, цяпер будзеш ведаць, як у печ бензін ліць!

Калі ў суправаджэнні ардынатараў і сясцёр у палату ўвайшоў Міронччык, Надзя яго сустрэла як даўно знаёмага. Узіраючыся ў яго разумныя, добрыя вочы, дзяўчына адчула, што гэтаму чалавеку не страшна даверыць жыццё.

## 3

Аднак у аперацыйнай Надзі стала не па сабе. Перад ёю стаяў урач у дзіўнай масцы і незвычайным фартуху. Побач у халатах і такіх жа масках мітусіліся людзі. Высокі стол, падобны на ложак, пад ім таз. Інструменты і колбачкі на століках накрытыя марляй.

— Ну, ну, Надзечка, смялей! — пачула яна знаёмы голас хірурга і баязліва, але даверліва, лягла на аперацыйны стол.

— Вось і малайчына. Ты адкуль?—спытаўся доктар, змазваючы ёдам месца для разрэзу.

— З Васілішкаўскага раёна... з вёскі...

— І я таксама з вёскі. Толькі са Слуцкага раёна. Быў я ў тваіх Васілішках. Значыць, мы з табой з вёскі... Я людзей лячу, а ты ім дамы будуеш... Добрыя ў нас з табой прафесіі, га?

Гэтым часам асістэнт накрывае хворую прасцінай, якая здаецца дзяўчыне такой хатняй! Надзя нават на момант забылася, што яна на аперацыйным стале. Гледзячы ў столь, яна слухае доктара.

— Давай дамовімся, Надзя. Будзе балець — кажы. Зараз укалю, крыху пацярпі, мілая. Вось і ўсё!.. Скажы, бацькі ў цябе ёсць? Маці і бацька, кажаш? Гм. Ты шчаслівейшая за мяне. А я з пяці год сірата... Даўно працуеш на будоўлях? Шэсць год? А якія дамы будавала ў Гродна?

— Рамонтна-падшыпнікавы завод. Яшчэ дом для сляпых... Ой, доктар!

— Хіба баліць? Зараз перастане. Гавары, гавары, Надзечка.

— Яшчэ электрастанцыю... Ой!

— Нічога, мілая. Яшчэ толькі замарожваю. А калі пачну аперацыю, скажу,— супакойвае хірург, шчоўкаючы зажымамі.

Надзя разгадала ўрача. Яна зразумела, што ідзе самая сапраўдная аперацыя — тая самая, якой яна так баялася. Аказваецца, не так ужо і боязна. Нават зусім цярпліва. І яна змаўкае, прыслухоўваецца.

Надзя хоча дапамагчы хірургу. Яна стараецца дыхаць роўна, не ўздрыгваць, не напінацца. Праўда, гэта ёй не зусім удаецца, і яна дыхае так, быццам нясе на сабе цяжар.

Убачыўшы, што пацыентка супакойваецца, хірург паскорвае аперацыю. Памочнікі-асістэнты і сёстры ловяць кожны яго рух, нават выраз вачэй і імкліва выконваюць яго волю. Пашчоўквае метал, звіняць шклянкі, чуецца ціхі, але ўладальны голас хірурга:

— Шпрыц!

— Скальпель!

— Зажым!

Аперацыя праходзіць хутка. Рукі хірурга робяць усё спрытна і лёгка. Гэта рэзультат вялікага вопыту. Нездарма Уладзімір Юсцінавіч у час вайны зрабіў чатыры тысячы аперацый. Колькі людзей цяпер успамінае яго шчырым, добрым словам.

**4**

Весялей звіняць апошнія зажымы і непатрэбныя інструменты, кінутыя ў таз. Мяккімі і беражлівымі рукамі хірург накладвае Надзі швы. Ён зноў жартуе з хворай:

— Вось і ўсё! А ты, ой ды ой!

— Ага! Вы рэжаце і пытаецеся, ці не баліць,— у тон доктару адказвае Надзя, расчырванелая ад напружання і шчаслівая, што ўсё мінула. Заўважыўшы мокры, як у жнівеньскую гарачыню, лоб доктара, Надзя гаворыць:

— Але ж і вам, доктар, дасталося таксама! Вочы ўрача і хворай сустрэліся. Яны зразумелі адзін другога. Выціраючы лоб, Уладзімір Юсцінавіч кажа:

— Бач, якой прыгажуняй я цябе зрабіў. Расчырванелася, як вішня. Ну, а цяпер папраўляйся і хутчэй выходзь замуж! Толькі мяне на вяселле запросіш, добра?

— Абавязкова! — смяецца Надзя, да якой сёстры падвозяць ужо каталку.

А праз некалькі хвілін у перадаперацыйнай хірург сядзеў на цвёрдай канапе, абабітай жоўтай цыратай, побач з дзесяцігадовым хлопчыкам, у якога ад страху трасліся калені.

Уладзімір Юсцінавіч гаворыць з хлопчыкам, як з дарослым:

— Скажыце мне, Іван Вікенцьевіч, кім вы думаеце стаць, калі скончыце школу?

— Лётчыкам...

— Дык хіба можна лётчыку баяцца з-за якога-небудзь апендыцыта? Вы ж зусім дарослы і разумны хлапец, падумайце самі!— намаўляе доктар.

Калі з аперацыйнай везлі Надзю, дзяўчына хацела яшчэ раз падзякаваць хірургу. Але якраз у гэты час Іван Вікенцьевіч неяк сур'ёзна, па-сталаму падаваў доктару сваю далоньку, якую бывалы хірург важна пацісnуў, «афармляючы» такім чынам дагавор на аперацыю. Надзя зразумела іх і прамаўчала.

Калі яна была ўжо ў калідоры, каталку дагнаў хлопчык, пахваліўся:

— Ага, і мне таксама доктар Міронческ будзе зараз аперацыю рабіць!

## 5

Але, як кажуць медыкі, на апендыцытах славы не заробіш!

Уладзімір Юсцінавіч часта бывае ў другіх бальніцах на складаных аперацыях. Яго возіць да хворых хуткая дапамога, на санітарным самалёце ён вылятае ў раённыя бальніцы кансультаваць урачоў і рабіць найбольш складаныя аперацыі.

А быў час, калі, убачыўшы акрываўленую жанчыну, хірург спалохаўся. І толькі ўсведаміўшы, што хворую прывезлі да яго, малады ўрач падышоў да яе і рашыўся на аперацыю. Гэта здарылася ў 1939 годзе ў адной сельскай бальніцы Віцебскага раёна, куды Міронческ пасля заканчэння Мінскага медінстытута быў прысланы на працу.

Аб сабе Уладзімір Юсцінавіч расказвае мала і як быццам апраўдваючыся:

— За дваццаць гадоў работы ўсё ніяк не магу прызвычаіцца да сваёй прафесіі. Варта мне толькі пачуць тэлефонны званок або даведацца, што дзесьці мяне чакаюць, як у мяне адразу ўсё страпянецца!

І дадае задумёна:

— Праўда, для гэтага ёсць у мяне падставы. Вось нядаўна прыходзіць адна маці з дзевяцігадовым дзіцем, гаворыць: «Доктар, мая дзяўчынка ўжо з паўгода кульгае. Паглядзіце, ад чаго гэта, га?..» Я паслаў яе на рэнтген і жахнуўся, калі глянуў на здымак. У дзяўчынкі ўся галёнка разрушана косным туберкулёзам!.. Або вось прыходзіць чалавек, кажа: «Доктар, у мяне ўжо даўно трэснула губа і ніяк не зажывае». Я глянуў, а ў яго... рак губы! Так, нялёгкі шлях хірурга. Але ўсё — і вялікая напружанасць ля аперацыйнага стала, і стомленасць, і бясконцыя трывогі — спаўна адплачваюцца радасцю, якую заўсёды адчуваеш, калі падумаеш, што ты выратаваў чалавеку жыццё. Я не ўяўляю сабе хірурга, не акрыленага гэтым пачуццём.

Уладзімір Юсцінавіч клапоціцца аб росце маладых урачоў і сясцёр. Маючы вялікі вопыт, Міронческ ведае, чаму перш за ўсё

трэба іх вучыць. Гэта ж і самому давялося перажыць час сумненняў і пошукаў. Прыйдзе пара, і маладыя медыкі, што нядаўна скончылі інстытуты, змогуць стаць такімі ж майстрамі сваёй справы, як У. Ю. Міронччык.

— Толькі паболей ініцыятывы, разважанняў над уласным вопытам, больш жывых думак, не абмежаваных аднымі толькі кніжнымі ведамі! — раіць моладзі хірург.— Гэтак у свой час мяне вучылі прафесары і дацэнты хірургіі ў Мінскім медыцынскім інстытуце — Корчыц, І ргер, Стальмашонак, Бобрык. І я пераканаўся, што яны мелі рацыю!

Нядаўна У. Ю. Міронччыку прысвоена ганаровае званне заслужанага урача БССР...

## VII. НЁМАНСКІЯ ВАДАЛАЗЫ

Так здарылася, што ў дзяцінстве Мікола застаўся сіратою. Аб яго лёсе паклапацілася Радзіма. Яшчэ ў дзіцячым доме марыў сп стаць вадалазам. Апранеш сабе скафандр і ідзеш у марскую пучыну, у няведамае царства Нептуна...

Але горкае расчараванне спасцігла Мікалая, калі яму першы раз давялося спускацца пад ваду. На яго нацягнулі пяціпудовы вадалазны касцюм-скафандр, шлем і свінцовыя галёшы, і дужы юнак ледзь перастаўляў ногі. Але адступаць не было куды, давялося лезці ў ваду, дзе яго адразу збіла цячэннем. Ён згубіў раўнавагу, перакуліўся ўверх нагамі і пайшоў на дно...

Калі Мікалая выцягнулі наверх, з яго сышло сем патоў. Навічок глянуў на гадзіннік. Пад вадою знаходзіўся ўсяго некалькі мінут, а здавалася, што цэлую вечнасць. Тады Мікалай успомніў аб вадалазах, якія праводзяць у вадзе па некалькі гадзін, аб трагічных выпадках і ўздрыгануўся. Ён упершыню зразумеў, што прафесія вадалаза — гэта подзвіг мужнасці і стойкасці.

З гадамі Мікалай Ганчароў набраў вопыту і ведаў. У якія толькі глыбіні ён ні апускаўся. За дзесяць год прабыў пад вадою больш двух тысяч з паловай гадзін!

На Балтыйскім моры падымаў са дна судны, якія затанулі ў гады вайны.

На Няве пракладваў кабель і газаправод.

На Беламорска-Балтыйскім канале рамантаваў шлюзы.

У партах будаваў сліпы.

За ўдзел у праектаванні і будаўніцтве новага тыпу абсталявання для пад'ёму суднаў маладому вадалазу Мікалаю Ганчарову ў 1952 годзе прысуджана Сталінская прэмія. На чале групы вадалазаў яго паслалі на Гродзеншчыну для аднаўлення фарватара на Нёмане.

У Нёмане тады тарчалі рэшткі маставых ферм, узарваных у гады першай і другой сусветных войнаў. Фарватар перагароджвалі

затопленыя баржы. У рэчцы хавалася мноства свай, увабітых яшчэ ў пятроўскія часы. Усё дно было завалена зброяй, кінутай адступаючымі салдатамі многіх войнаў і пакаленняў. У рачных глыбінях ляжалі рэшткі ўзарваных быкоў. Таіліся міны і неўзарваныя авіябомбы. Па рацэ тады не мог праплысці ні адзін параход. І неманскі фарватар чысцілі вадалазы Уладзімір Чыміраў, Іван Ніцун і Цімур Блізнюк, якімі кіраваў Мікалай Ганчароў.

Вы плывяце ўздоўж берага і любуецеся ціхай гладдзю ракі.

Серабрацца кроплі, сцякаючы з вёслаў. Цягнуцца па цячэнню жывыя грывы водарасцяў — зялёныя, сакавітыя. Ля берага ў праменні сонца грэюцца эскадрыллі маленькіх рыбак. Зіхацяць вясёлкай перламутравыя ракавінкі.

Вы ўспамінаеце песню пра «ціхі Нёман». Вам і ў галаву не прыйдзе, што спакой гэты надта ж падманлівы. І наўрад ці вы звернеце ўвагу на невялікую баржу. На ёй гудзе кампрэсар, падаючы праз шлангі пад ваду паветра. Чалавек, які стаіць на баржы з мікрафонам у руках, падтрымлівае сувязь з вадалазамі. Ён насцярожаны. Гэты чалавек добра ведае, які Нёман «ціхі». У цёмнай глыбіні, дзе ўсё кіпіць, працуюць вадалазы. Там клубяцца вадавароты, віры, бушуюць перапады. Вада гоніць тоны пяску, коціць валуны, бярвенні. Вадалаза на кожным кроку падсцерагаюць нечаканасці. Плынь можа кінуць яго на вострыя сваі, заблытаць у дроце, абарваць шланг.

Расце індустрыяльная Гродзеншчына. Расце і аб'ём падводных работ на Нёмане. Вадалазы цяпер пракладваюць трубы, кабель, устанаўліваюць воданапорныя збудаванні. Гэтая работа пад вадой падобна подзвігу. Яна патрабуе напружання ўсіх сіл, мужнасці, спрыту.

## VIII. СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ

Каб падрабязна расказаць людзям пра Гродна, настаўніку рускай гімназіі Еўстафію Астроўскаму яшчэ да рэвалюцыі патрабавалася напісаць сем кніжак. Пазней польскі прафесар Ядкоўскі ўжо не змог ахапіць усе матэрыялы пра горад у дзесяці кніжках. Наш сучаснік прафесар Воронін выдаў у Ленінградзе таўшчэзную кнігу «Старажытнае Гродна», якая апавядае аб падзеях усяго двух — трох вякоў. Багаты сваім мінулым наш абласны цэнтр. Я паспрабую расказаць у лічбах пра яго сённяшні дзень.

Некаторыя сцвярджаюць, што лічбы нецікавая, сумная рэч. Іншыя, наадварот, гавораць, што лічба больш скажа, чым слова «шмат», «багаты», «вялікая колькасць». Але, відаць, не знойдзецца ніводнага чалавека, якога не зацікавілі б лічбы, што характарызуюць

Гродна. Бо за тысячагадовую гісторыю свайго існавання такі бурлівы рост горад перажывае ўпершыню.

Наш горад раскінуўся на маляўнічых берагах Нёмана на плошчы ў дваццаць адзін квадратны кіламетр.

Даўжыня трыста пятнаццаці гродзенскіх вуліц — сто васемнаццаць кіламетраў, гэта адлегласць ад Гродна да Зельвы. Дзесяць з паловай тысяч дрэў расце на гэтых вуліцах. Плошчы двух паркаў і дзевяці скевераў — трынаццаць гектараў. Іх упрыгожваюць васемнаццаць скульптур і помнікаў.

У шасці тысячах дамах жыве каля васьмідзесяці тысяч жыхароў, а ў 1939 годзе — да ўз'яднання — іх было ўсяго сорак дзевяць тысяч ды палова з іх загінула ў вайну.

На сарака двух гродзенскіх прамысловых прадпрыемствах працуе сем з паловай тысяч рабочых. Вось што яны выпускаюць за адзін дзень:

пяць з палавінай кіламетраў тканіны,
тры тысячы пар абутку,
дваццаць шэсць тысяч бутэлек,
трыццаць восем тысяч куфляў піва,
дзесяць мільёнаў папяросаў.

У цэнтральную ашчадную касу штодзённа паступае сто тысяч рублёў зберажэнняў. Сорак паштальёнаў кожны дзень разносяць трыццаць тысяч газет і часопісаў і шэсць тысяч пісьмаў, а пяць тысяч газет і часопісаў кожны дзень прадаюць кіёскі. Па тэлефону бывае за дзень дзве тысячы міжгародніх размоў і не толькі з Масквой, Ленінградам, але і з Прагай, Варшавай, Берлінам...

Мы зайшлі ў загс. У гэты дзень у Гродна ажанілася сем пар. Восем шчаслівых бацькоў зарэгістравалі нованароджаных.

У радзільным доме нам паказалі новых грамадзян, якія з'явіліся на свет за мінулыя суткі. Над іх ложкамі вісяць дошчачкі з імёнамі пакуль што іхніх мацярок. На дошчачках яшчэ відаць лічбы. Гэта вага ў грамах. Усе восем грамадзян важаць толькі дваццаць дзевяць кілаграмаў! Але галоўны ўрач Гродзенскага радзільнага дома Павел Яфімавіч Церашкоў нас супакоіў. Ен кажа, што цяпер вага кожнага дзіцяці на трыста — чатырыста грамаў большая, чым тых, што нараджаліся восем гадоў назад.

Пры панскай Польшчы ў Гродна была толькі адна навучальная сельскагаспадарчая ўстанова... курсы кавання коней. Яе гадавы бюджэт складаў шэсцьсот злотых. Цяпер у горадзе ёсць сельскагаспадарчы інстытут. Яго бюджэт шэсць з паловай мільёнаў рублёў у год!

Да вайны ў Гродна студэнты-медыкі прыязджалі толькі на канікулы. Цяпер ёсць свой мединстытут!

У горадзе дваццаць чатыры разнастайныя навучальныя ўстановы. У іх працуе тысяча выкладчыкаў і выхавацеляў. Тысяча медсясцёр і ўрачоў сцерагуць здароўе гаражан.

Цяпер гродзенскае неба, як у Маскве і Мінску, упрыгожваюць сілуэты сталёвых кранаў. Аднойчы і мы накіраваліся да бліжэйшага бу-даўніцтва — жылога дома на Рабочай вуліцы. Звяртаемся да маладога хлопца з прапановай расказаць што-небудзь.

— Калі няма чаго! — саромеецца хлапец.

— Ну, хоць што-небудзь! — просім яго.— Напрыклад, сваю біяграфію...

— А ў мяне яе няма. Ну, працую кранаўшчыком будтрэста. Мне дваццаць год. Пасля заканчэння сямігодкі паступіў у будаўнічую школу. Затым будаваў Мінск. Стаў мулярам пятага разраду. Адначасова вучыўся на кранаўшчыка, здаў экзамен, і мяне паслалі ў Гродна. Тут далі кран, на ім і працую. План выконваю на дзвесце сорак працэнтаў, зарабляю калі тысячу чатырыста, калі паўтары. Збіраюся паступіць у вячэрнюю школу. Вось і ўсё! А зваць мяне Віктар Сіняўскі.

— Ну, яшчэ што-небудзь раскажы, Віця!

— А што яшчэ. Здаецца, зусім нядаўна я з зайздрасцю глядзеў на мінскага кранаўшчыка, а сёння з пляцоўкі ўжо на мяне таксама глядзяць тутэйшыя хлопцы. Прафесію сваю люблю. Ды і як не любіць! У тваім распараджэнні вялізны кран. Лёгкі рух рукі, і агромністая страла са стальнымі тросамі робіцца паслухмянай, быццам яна зраслася з тваімі нервамі і мускуламі.

Нясеш у катлаван першыя бетонныя блокі, укладаеш. Брыгадзір Саша Трашкоў ужо мосціць на іх цэглу.

— Саша, глядзі, што мы знайшлі! — крычаць яму дзяўчаты-падсобніцы і паказваюць падкову.

— Давай сюды,— гаворыць ён і кельмай замуроўвае падкову ў сцяну,— на шчасце навасёлам!

А знізу толькі і чуеш:

— Віця, цэглу!

— Віктар, панелі давай!

— І вось пройдзе месяц-другі, вырасце дом. Выведуць кроквы, накрыюць. А потым і шчас-лівыя навасёлы з'явяцца. Табе і сумна раставацца з будынкам, у які ты ўклаў сваю душу, і радасна, што зрабіў людзям нешта прыемнае, карыснае.

Вось якая ў нас у Гродна моладзь.

## IX. ПРА «САМАБЫТНАСЦЬ»

У Ваўкавыскім раёне ёсць вёска Дубаўцы. За вёскай ля дарогі ляжаць два валуны. Гісторыя іх такая.

Калісьці на гэтым месцы сустрэліся два вяселлі. Адзін малады ехаў у Воўпу вянчацца, другі з маладой вяртаўся з царквы. А тады панавала павер'е: калі малады каму-небудзь саступіць з дарогі, будзе нешчаслівы. Таму ніхто з іх не хацеў саступаць. Пачалі біцца. Упаў мёртвым адзін, загінуў і другі. Цяпер на гэтым месцы і ляжаць два валуны.

Ёсць яшчэ карэспандэнты, якія, прыехаўшы з Мінска ў Гродна, патрабуюць паказаць ім перш за ўсё «самабытнасць»: людзей, апранутых у старую нацыянальную вопратку, моладзь, якая толькі і робіць, што танцуе «Лявоніху», а на вяселлях спраўляе старажытныя абрады. Дзіўна бывае слухаць такога таварыша. Даўно вядома, што прывабнасць і рамантычнасць старажытнасці існуе толькі ў легендах, а на самай справе ўсё выглядала куды горш. Дастаткова напомніць пра валуны ля Дубаўцоў...

Цяпер нават у самай далёкай ад горада вёсцы моладзь танцуе, як у Мінску і Маскве. Вопратка хлапцоў і дзяўчат у нас на Гродзеншчыне ніколькі не адрозніваецца ад той, якую носяць іхнія сябры ў Маскве і Мінску. Калі праўленне калгаса ўзнагароджвае сваю свінарку, гадзіннік ёй ужо не падарунак — яна мае свой. І ў загс нашы маладыя едуць больш на машынах. І не забываюць, вядома, сваё нацыянальнае. Народ любіць сваю гісторыю. «Лявоніху» танцуе кожны гурток самадзейнасці, і яе ахвотна глядзяць на сцэне. Ахвотна слухаюць пра старыя абрады і звычкі. Аднак цяпер на Гродзеншчыне не гэта асноўнае. За дваццаць год з дня ўз'яднання Гродзеншчына зраўнялася з іншымі абласцямі нашай Радзімы. Ці, таварышы карэспандэнты, гэта менш цікава, чым «самабытнасць», на пошукі якой вы да нас прыязджаеце?

Усяго толькі два дзёсяцігоддзі таму назад у нас запалкі расшчаплялі на дзве палавінкі, а самая звычайная іголка ў сялянскай сям'і была самай каштоўнай рэччу. Пад гнётам панскай Поль-шчы на Гродзеншчыне прамысловасць амаль не развівалася. Вырабы яе каштавалі вельмі дорага, і таму гродзенцы карысталіся самаробнымі драўлянымі баронамі, хадзілі ў дамаатканым адзенні і лапцях.

Непадалёку ад маёй роднай вёсачкі Страшэва знаходзіцца мястэчка Гарадок. Туды я хадзіў у польскую школу. Нейкі прадпрыймальнік завёў у Гарадку маленькую тэкстыльную фабрыку. Ідучы дахаты, я часта заглядаў праз пабітае шкло ў яе адзіны цэх, дзівіўся ткацкім станкам, якія тарахцелі, быццам кулямёты.

Але асабліва мяне цікавіў адзін куток на фабрыцы, з усіх бакоў закрыты фанернымі перагародкамі. У гэтай скрынцы адзін рабочы ўпраўляўся адразу з двума станкамі, і фабрыкант плаціў яму ў паўтара раза больш. Рабочы старанна ахоўваў сваю тайну. Станкі ён закрываў фанернай будкай, а ў дзвярах паставіў сына, пазбавіўшы яго магчымасці наведваць школу. Ён старанна ахоўваў свой, так сказаць, фірменны сакрэт, таму што добра ведаў: фабрыкант кідае

яму падачку да таго часу, пакуль тайна не раскрыта іншымі. Умельца ненавідзелі рабочыя цэха. Яны празвалі яго панскім халуём і не раз пагражалі правучыць па заслугах. Што і казаць, пачын і кемлівасць дваццаць год назад не была ў пашане!

Пасля вайны адзін выпадак, быццам рэха, напомніў мне аб мінулым.

Восенню 1946 года мы, студэнты Гродзенскага педагагічнага інстытута, сабраліся на субот-нік у двары гарадской электрастанцыі. Цягалі цэглу, кантавалі скрынкі з машынамі. Тады пра аднаўленне гарадской ТЭЦ гаварылі, як пра нешта звыш асаблівае. Яе недасягаемая тады даваенная магутнасць у тысячу шэсцьсот кілават здавалася нечым зусім фантастычным. З мятага, скалечанага бомбамі жалеза гродзенскія інжынеры нейкім цудам сабралі два катлы, дзве турбіны, дынама. Але ўсё стаяла, таму што для адной дынамамашыны не хапала дэталі.

Ля новага будынка электрастанцыі дабудоўвалі градзірню для ахаладжэння адпрацаванай вады, але яна цікавіла нас менш. Мы імкнуліся пабываць у машыннай зале. У зручны выпадак, нібы напіцца вады або перавязаць паранены цвіком палец, мы забягалі туды, у гэты таемны цэнтр загадкавых труб і прыстасаванняў. Заўважыў гэта галоўны інжынер электрастанцыі, сабраў усіх нас і павёў, быццам экскурсантаў.

У зале стаялі дзве дынамамашыны, кожная па восемсот кілават. Адна была латаная-пералатаная. Па яе крутых баках збягалі кроплі, як збягаюць яны па целе, калі вылазіш з вады. Другую хавала вялізная фанерная скрынка з акенцамі.

— Хлопцы, туды заглядаць нельга!—папярэдзіў інжынер дасціпных студэнтаў.

— А хто там? — запыталі мы.

— Шведы.

— Шведы? У нас? У Гродна?—здзівіліся мы.

— Так... Замяняюць дэталь...

— Навошта ж яны загарадзіліся фанерай?

І вось што тады расказаў нам галоўны інжынер:

— Некалі гэтую дыпамамашыну гарадская ўправа набыла ў Швецыі. Новую дэталь мы заказалі ў Стакгольме. Фірма выканала заказ, але з умовай, што замяняць дэталь будуць толькі яе прадстаўнікі. Нядаўна шведскія тэхнікі прывезлі дэталь і патрабавалі, каб ніхто не глядзеў на іх работу, таму што яны не маюць права выдаваць прафесійны сакрэт фірмы.

— Але навошта ж яны ад нас хаваюцца? — не маглі зразумець студэнты, якія выраслі ў гарадах і вёсках ўсходніх абласцей Беларусі.

Студэнты-«заходнікі» маўчалі. Яны ўсё добра разумелі...

У гэты час з фанернай будкі выйшлі два рослыя белабрысыя хлапцы, і разыгралася нямая сцэна. Мы разглядалі іх скураныя курткі

незвычайнага пакрою, начышчаныя да люстранага бляску туфлі, а яны — нашы растаптаныя на франтавых дарогах кірзавыя боты і патрапаныя шынялі. Мы не маглі даравацъ шведам іх выдумак, і ніхто з нас нават не ўсміхнуўся іншаземцам...

Цяпер абодва гэтыя выпадкі з фанернымі будкамі здаюцца анекдатычнымі. Ды я, мабыць, і сам не паверыў, калі б не бачыў іх сваімі ўласнымі вачыма.

У нашыя дні ў Гродна ўзвышаюцца ўжо тры градзірні, а самая маленькая з іх тая, якую пабудавалі ў 1946 годзе. Гарадская ТЭЦ дае ўжо не тысячу шэсцьсот, а чатырнаццаць тысяч кілават.

Падобна электрастанцыі, на Гродзеншчыне ўзняліся з руін або пабудаваны нанова мэблевая фабрыка, тонкасуконны камбінат, завод жа-лезабетонных канструкцый, шаснаццаць цагляных заводаў, цукровы завод у Скідзелі, абутковая фабрыка ў Лідзе...

Велізарны Савецкі Саюз, і на карце краіны нашу Гродзеншчыну няцяжка прыкрыць адным пальцам. Але ў кантрольных лічбах, прынятых XXI з'ездам, знайшлося месца і для яе. Там сказана аб Беларусі: «Новыя прамысловыя прадпрыемствы будуць пабудаваны ў заходніх абласцях, якія мелі ў мінулым нізкі ўзровень прамысловага развіцця».

За сем год валавая прадукцыя прамысловасці ў нашай вобласці ўзрасце амаль удвая. За 1959-1965 гады дзяржава асігнуе нам для капіталаўкладанняў больш двух мільярдаў рублёў. За сямігодку будуць пабудаваны:

абутковая фабрыка ў Гродна,
завод дэталей да аўтамашын,
вялікая швейная фабрыка,
завод электраправада,
торфаздабываючыя прадпрыемствы.

Непадалёку ад Гродна, у Грандзічах, будуецца завод сілікатнай цэглы на сто дзесяць міль-ёнаў штук у год! Калі выкласці гэтую цэглу ў адзін рад, ёй можна апаясаць увесь зямны шар!

Новымі прадпрыемствамі папоўніцца харчовая прамысловасць вобласці. У Ваўкавыску ўжо ў 1961 годзе закончыцца будаўніцтва магутнага мясакамбіната, прадукцыя якога ў тры разы перавысіць магчымасці мясакамбіната ў Гродна, які цяпер лічыцца буйнейшым.

Для ўсіх гэтых прадпрыемстваў трэба шмат электраэнергіі. Таму на дапамогу Гродзенскай ТЭЦ праз нашы палі і лясы пракладаецца амаль пяцьсот кіламетраў ліній высакавольтных пера-дач. Па іх пойдзе ток з Бярозаўскай ДРЭС, якая будуецца ў суседняй Брэсцкай вобласці.

Адначасова з высакавольтнай лініяй прыйдзе газ з Украіны. Ён таксама папоўніць энергетычныя рэсурсы вобласці.

За сямігоддзе нашы чатырыста калгасаў атрымаюць амаль дванаццаць тысяч трактараў — па дваццаць пяць машын на калгас!

За гэтыя ж гады гродзенцы пабудуюць сотні палацаў культуры, клубаў, кінатэатраў, школ-інтэрнатаў і іншых культурна-бытавых установ.

Старому гарадоцкаму ткачу давялося нямала пераждаць за яго працоўную кемлівасць. Савецкая ўлада, як толькі два дзесяцігоддзі таму назад прыйшла на Гродзеншчыну, разламала ўсе фанерныя клеткі і дала прастору народным сілам.

Праўда, у гіганцкіх маштабах Савецкага Саюза дасягненні гродзенцаў яшчэ вельмі сціплыя. Але, успамінаючы часам нямую сцэну трынаццацігадовай даўнасці на Гродзенскай ТЭЦ, я хацеў бы пабачыць выраз твару шведскіх тэхнікаў, калі б яны зноў заглянулі да нас гадкоў гэтак праз сем, а то і раней... Бо яшчэ ў мінулым годзе на Сусветнай выстаўцы ў Бруселі красавалася прадукцыя нашага Нёманскага шклозавода і заваявала там бронзавы медаль. А шведскія канкурэнты яшчэ да сённяшняга дня раўніва захоўваюць вытворчыя сакрэты, што даўно ўжо сталі здабыткам далёкага індустрыяльнага мінулага...

***Гродна. Жнівень, 1959.***

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год